# ПАДХАПІЦЬ БАЯВЫ ЗАКЛІК таварыша ГІКАЛО

## МАЛАДЫМ ДЭПУТАТАМ СЕЛЬСОВЕТАЎ АД КАЛГАСАЎ РАГАЧОЎСКАГА РАЁНА



ПРАЧЫТАЎ У ГАЗЕЦЕ «ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА» ВАША ПІСЬМО. ДАСЯГНЕННІ, АБ ЯКІХ ВЫ ГАВОРЫЦЕ, ЕСЦЬ РЭЗУЛЬТАТ БАРАЦЬБЫ ЗА ЗАМОЖНАЕ І КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЕ, ЯКОЕ ВЯДУЦЬ КАЛГАСНЫЯ МАСЫ ПАД КІРАЎНІЦТВАМ КОМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ.

АЛЕ НЕ ЗАЗНАВАЙЦЕСЯ, ТАВАРЫШЫ! РАБОТАЙЦЕ ЯШЧЭ ЛЕПШ, АВАЛОДВАЙЦЕ ВЕДАМІ ТЭХНІКАЙ СВАЕЙ СПРАВЫ, НА СВАІМ УЧАСТКУ РАБОТЫ НАСТОЙЛІВА І ЎДУМЛІВА ВУЧЫЦЕСЯ ВЯЛІКАЙ СПРАВЕ — КІРАВАННЮ ДЗЯРЖАВАЙ.

ВАША ПРАПАНОВА АБ СПАБОРНІЦТВЕ НА ЛЕПШУЮ РАБОТУ СЕКЦЫЙ ЗАСЛУГОЎВАЕ ЎСЯМЕРНАГА ПАДТРЫМАННЯ.

РАЗГОРТВАЙЦЕ СПАБОРНІЦТВА ПА-БАЯВОМУ!

УПЭЎНЕН, ШТО ЎСЕ МАЛАДЫЯ КІРАЎНІКІ СЕКЦЫЙ САВЕТАЎ БССР ПАСЛЕДУЮЦЬ ВАШАМУ ДОБРАМУ ПРЫКЛАДУ.

*Сакратар ЦК КП(б)Б ГІКАЛО*

**60 маладых дэпутатаў новаабраных советаў зоны дзейнасці Рагачоўскай МТС звярнуліся 30 лістапада з лістом да сакратара ЦК КП(б)Б таварыша ГІКАЛО Н. Ф.**

У лісце да Нікалая Федаравіча маладыя дэпутаты — комсамольцы і калгасная моладзь расказвалі аб сваім жыцці і аб сваёй рабоце. «МНОГА ЗРОБЛЕНА НАШАЙ ПАРТЫЯЙ І СОВЕЦКІМ УРАДАМ ДЛЯ ПРАЦОЎНАЙ МОЛАДЗІ, АСАБЛІВА ДЛЯ НАС, МАЛАДЫХ КАЛГАСНІКАЎ, — пісалі маладыя дэпутаты, — ТОЛЬКІ ДЗЯКУЮЧЫ ПАРТЫІ І СОВЕЦКАЙ УЛАДЗЕ, ЯКІЯ СТВАРЫЛІ КАЛГАСЫ, МЫ, МОЛАДЗЬ, СТАЛІ НІ АД КАГО НЕЗАЛЕЖНЫМІ, МЫ НЕ БАІМСЯ ЗАЎТРАШНЯГА ДНЯ». Гэтыя словы маладыя дэпутаты пацвярджалі радам нікім неаспрэчаных фактаў. Комсамолец Раждаеў Нічыпар пісаў: «Раней, калі я жыў з сваімі бацькамі на аднаасобнай гаспадарцы, Я НЕ ВЫЛАЗІЎ З САМАТКАНКІ І ЛАПЦЕЙ. А цяпер я маю ДВА ПАЛІТО (зімняе і асеннняе), ПАРУ КАСЦЮМАЎ, БОТЫ, БАЦІНКІ. Я ВУЧУСЯ Ў ВЯЧЭРНЯЙ ШКОЛЕ КАЛГАСНАЙ МОЛАДЗІ, ВЫПІСВАЮ І ЧЫТАЮ ГАЗЕТЫ...»

Дзесяткі і сотні тысяч маладых калгаснікаў могуць расказаць аб гэтым партыі і ураду, якія вывялі працоўнае сялянства і іх дзяцей на шырокі, светлы і радасны шлях — шлях калгаснага жыцця.

Друкуемы сёння наказ сакратара ЦК КП(б)Б тав. Н. Ф. ГІКАЛО ставіць рад важнейшых задач перад маладымі дэпутатамі, якія прышлі да руля кіраўніцтва дзяржавай. ГАЛОЎНАЕ ЗАРАЗ — НЕ ЗАЗНАВАЦЦА, ПРАЦАВАЦЬ ЯШЧЭ ЛЕПШ.

Таварыш ГІКАЛО — ухваляючы прапанову дэпутатаў Рагачоўшчыны аб разгортванні спаборніцтва на лепшую работу секцый, заклікае разгарнуць спаборніцтва па-баявому. Няма сумнення ў тым, што заклік таварыша ГІКАЛО ДРУЖНА ПАДХОПЯЦЬ УСЕ МАЛАДЫЯ ДЭПУТАТЫ СОВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ. Гэты масавы ініцыятыўны рух АБАВЯЗАНЫ ЎЗНАЧАЛІЦЬ УСЕ КОМСАМОЛЬСКІЯ АРГАНІЗАЦЫІ.

Трэба разгарнуць работу так, каб ажыццявіць кожны пункт наказа, які вынесены былі на выбарчых сходах, каб у работу советаў [illegible] уцягнуць дзесяткі тысяч працоўных.